острого течения балантидиоза. Поросята первой опытной группы содержались в условиях нормативного микроклимата (температура воздуха 20,5 $^0$С. относительная влажность – 67%, аммиак - 5мг/м$^3$), поросята второй опытной группы – в условиях неудовлетворительного микроклимата (температура воздуха 11,0 $^0$С, относительная влажность – 77%, аммиак - 25мг/м$^3$) и были подвергнуты лечению метронидом, который вводили внутримышечно в дозе 2 мл (100 мг метронидазола) на 10 кг массы тела поросят три дня подряд. Поросята контрольной группы лечению не подвергались и содержались в условиях неудовлетворительного микроклимата. Условия кормления и ухода для всех подопытных групп поросят были одинаковыми и соответствовали принятой в хозяйстве технологии.

В результате проведенных исследований было установлено, что в начале опыта в опытных и контрольной группах больных поросят интенсивность балантидиозной инвазии (ИБИ) находилась в пределах 70-95 вегетативных форм в 20 п.з.м. с клиническими признаками проявления болезни. После лечения ИБИ постепенно снижалась и через 15 дней была наименьшей (10-15 балантидий в 20 п.з.м.) у поросят в условиях нормативного микроклимата. При этом у поросят отсутствовали клинические признаки болезни. У поросят второй опытной группы (неудовлетворительный микроклимат) после лечения ИБИ снижалась медленно и составляла к 15 дню после лечения 30-35 балантидий в 20 п.з.м. У контрольных животных ИБИ очень медленно снижалась к 15 дню (60-65 балантидий в 20 п.з.м.) с клиническими признаками болезни, при этом пало три поросенка.

Таким образом, в условиях нормативного микроклимата отмечалось выздоровление поросят, больных балантидиозом, на четыре дня раньше, а среднесуточный прирост их живой массы на 36 г больше по сравнению с животными, которые подвергались лечению в условиях неудовлетворительного микроклимата.

УДК 94 (47+57)

**ПАЎЛЮКЕВІЧ М.В.**, студэнтка
Навуковы кіраўнік **ЮРГЕВІЧ Н.К.**, ст. выкладчык
УА «Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»

## ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ. АПЕРАЦЫЯ “БАГРАЦІЁН”

Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён" па свайму размаху, колькасці сіл, што ўдзельнічалі ў ёй, з'яўляецца адной з

буйнейшых не толькі Вялікай Айчыннай вайны, але і ўсёй Другой сусветнай вайны. З абодвух бакоў з улікам рэзерваў, якія прыбывалі ў ходзе баёў, у ёй удзельнічалі больш за 4 млн. чалавек. У барацьбе за вызваленне Беларусі савецкія воіны праявілі масавы гераізм і самаадданасць.

Восенню 1943 г. пасля разгрому нямецка-фашысцкіх войск на Курскай дузе Чырвоная Армія прарвала шэраг абарончых рубяжоў праціўніка і выйшла да ўсходніх раёнаў Беларусі. Савецкія войскі восенню 1943 г. - зімой 1944 г. не змаглі выканаць задачу – разграміць нямецкую групу армій "Цэнтр" і вызваліць Беларусь ад захопнікаў. Асноўнымі прычынамі няўдач можна назваць нездавальняючае кіраўніцтва з боку камандавання франтоў, грубыя парушэнні камандзірамі і штабамі правіл арганізацыі, забеспячэння і вядзення наступлення. Не заўсёды рацыянальна ствараліся групоўкі войск, былі сур'ёзныя пралікі ў выкарыстанні танкаў і арганізацыі разведкі. У выніку, Чырвоная Армія несла цяжкія страты і марудна прасоўвалаіся наперад [1; с. 27]. Аднак савецкія войскі нанеслі гітлераўцам вялікія страты, вызвалілі поўнасцю ці часткова 36 раёнаў нашай рэспублікі, 36 раённых цэнтраў і два абласныя - Гомель і Мазыр. Да моманту наступлення Чырвонай Арміі (восень 1943 г.) большасць насельніцтва Гомельскай, Палескай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей аказалася хворым на тыф. Трэба адзначыць, што адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, фашысты гналі ў свой тыл як здаровае, так і хворае насельніцтва і тым самым рабілі перашкоды для прасоўвання Чырвонай Арміі на захад. Як сведчаць архіўныя дакументы, у снежні 1943 г. у вызваленых раёнах БССР было выяўлена 4911 хворых на тыф, а ў студзені 1944 г. – 9745 чалавек [2; с. 42]. Адзначым, што лічбы былі недакладнымі.

Чырвоная Армія замацавалася на пазіцыях, з якіх летам 1944 г. пачалася славутая беларуская наступальная аперацыя "Баграціён" (23 чэрвеня – 29 жніўня 1944 г.). 22 чэрвеня 1944 г. лінія фронту праходзіла на ўсход ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Бабруйска і далей па р. Прыпяць да Ковеля. Савецкім войскам тут супрацьстаяла найбольш моцная групоўка вермахта: правафланговыя злучэнні 16-й арміі групы армій "Поўнач", група армій "Цэнтр" у складзе 3-й танкавай, 4-й, 9-й і 2-й палявых армій, а таксама левафланговыя злучэнні 4-й танкавай арміі, якая ўваходзіла ў групу армій "Паўночная Украіна" - усяго 63 дывізіі і 3 брыгады [4; с. 191 - 192].

Асноўная мэта аперацыі патрабавала рассекчы абарону праціўніка ў некалькіх месцах, акружыць і знішчыць войскі яго асноўных груповак. Для правядзення Беларускай аперацыі прыцягваліся сілы чатырох франтоў: 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы генерал арміі І.Х. Баграмян), 3-га Беларускага (камандуючы генерал-палкоўнік І.Д. Чарняхоўскі), 2-га Беларускага (камандуючы генерал-палкоўнік Г.Ф.

Захараў) і 1-га Беларускага (камандуючы генерал арміі К.К. Ракасоўскі), авіяцыя далёкага дзеяння і Дняпроўская ваенная флатылія [4; с. 192].

Планам аперацыі «Баграціён» прадугледжваліся таксама актыўныя дзеянні беларускіх партызан і іх узаемадзеянне з войскамі Чырвонай Арміі. Напрыклад, найбуйнейшай акцыяй беларускіх партызан у перыяд падрыхтоўкі да аперацыі «Баграціён» стаў трэці этап «рэйкавай вайны». У ноч з 19 на 20 чэрвеня 1944 г. партызаны падарвалі 40775 рэек, паралізавалі рух на важнейшых чыгунках. Працягваючы ўдары ўжо ў перыяд паспяховага наступлення Чырвонай Арміі, партызаны да 29 чэрвеня падарвалі 80 тыс. рэек [3; с. 198]. У выніку, адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, немцы не маглі скарыстаць чыгуначны транспарт у неабходным аб'ёме як для перавозкі рэзерваў, так і эвакуацыі сваіх тылоў.

Аперацыю можна падзяліць на два этапы. У ходзе першага з іх (23 чэрвеня – 4 ліпеня) савецкія войскі прарвалі фронт і акружылі ў раёнах Мінска, Бабруйска, Віцебска, Оршы і Магілёва буйныя нямецкія групіроўкі. 25 чэрвеня ў раёнах Віцебска і Бабруйска трапілі ў акружэнне 11 нямецкіх дывізій. Пад Бабруйскам савецкія войскі ўпершыню прымянілі масіраваны ўдар авіяцыі, які дэзарганізаваў нямецкія часці.

У гэты час галоўныя сілы 1-га Беларускага фронту працягвалі наступленне на Асіповічы і Слуцк. 28 чэрвеня былі вызвалены Старыя Дарогі, 30 чэрвеня - Слуцк. 2 ліпеня савецкія войскі пры падтрымцы партызан авалодалі Стоўбцамі, Гарадзеяй і Нясвіжам і перарэзалі камунікацыі мінскай групоўкі праціўніка на Баранавічы, Лунінец і Брэст.

Самае моцнае супраціўленне ворага на мінскім напрамку савецкія войскі сустрэлі на рубяжы па р. Бярэзіна, асабліва ў раёне Барысава, Нова-Барысава і Зембіна. 3 ліпеня 1944 г. была вызвалена сталіца Беларусі – г. Мінск. У Мінскім "катле", які знаходзіўся на ўсходзе ад горада, апынулася 105-тысячная варожая групоўка.

Жахлівую карціну ўбачылі савецкія воіны на ўскраіне Мінска - у Трасцянцы. Тут палалі гіганцкія вогнішчы, на якіх гарэлі трупы савецкіх людзей, перакладзеныя бярвёнамі (так гітлераўцы спрабавалі замесці сляды сваіх злачынстваў). У канцлагеры "Трасцянец" было знішчана больш за 206 тыс. савецкіх людзей і грамадзян з розных краін Еўропы [4; с. 129].

4 ліпеня пачаўся другі этап аперацыі "Баграціён" - барацьба за канчатковае вызваленне Беларусі. У гэты дзень вяліся баі войскаў 3-га Беларускага фронту на рубяжы Нарач - Смаргонь - Маладзечна - Красная Волма. 5 ліпеня былі вызвалены гг. Маладзечна і Валожын. 16 ліпеня ў ходзе начнога бою войскі гэтых франтоў авалодалі важным умацаваным раёнам гітлераўцаў - горадам і крэпасцю Гродна [2; с. 19].

Войскі 2-га Беларускага фронту вызвалілі Навагрудак, Ваўкавыск. Вялікія поспехі былі дасягнуты ў паласе наступлення 1-

га Беларускага фронту. 4 ліпеня быў вызвалены Пінск, 8 ліпеня - Слонім. Савецкія войскі імкліва набліжаліся да дзяржаўнай мяжы. 21 ліпеня часці 65-й арміі перасеклі яе ў раёне Белавежскай пушчы і пачалі вызваленне Польшчы. 27 ліпеня пасля магутных удараў артылерыі і авіяцыі войскі 28-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант А.А. Лучынскі) і 70-арміі (камандуючы генерал-лейтэнант В.С. Папоў), што падышла з поўдня, замкнулі кальцо акружэння вакол Брэста. 28 ліпеня 1944 г. стаў знамянальным днём у гісторыі беларускага народа: узяццем Брэста савецкія войскі завяршылі выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з беларускай зямлі.

У выніку паспяховага ажыццяўлення Беларускай наступальнай аперацыі "Баграціён" савецкія войскі поўнасцю разграмілі 17 дывізій і 3 брыгады ворага, 50 дывізій страцілі больш за палову свайго складу. Было знішчана і ўзята ў палон больш за 500 тыс. салдат і афіцэраў. Захопленыя ў палон генералы і афіцэры на допытах адзначалі, што нямецкае Вярхоўнае камандаванне не кіравала адступленнем і не намеціла загадзя рубяжоў адступлення. Усе загады зводзіліся да закліку: "Трымацца любой цаной" [3; с. 21]. Страты савецкіх войск 1-га Прыбалтыйскага, 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх франтоў і Дняпроўскай ваеннай флатыліі ў Беларускай наступальнай аперацыі "Баграціён" склалі 765815 чалавек, у тым ліку беззваротныя - 178507 салдат і афіцэраў. Савецкія войскі страцілі 2957 танкаў і САУ, 822 самалёты, 2447 гармат і мінамётаў [3; с. 238].

Вялікая бітва за Беларусь ужо стала гісторыяй, а гістарычная памяць - гэта напамін пра слаўныя і трагічныя старонкі з жыцця нашага народа. Яна дапаможа нам засцерагчыся кары ад бяспамяцтва, не дасць забыць нашай гісторыі і традыцый, каб адданай любоўю і пашанай берагаць усё адвечнае і высакароднае, што абаранілі для нас удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны.

*Спіс літаратуры. 1. Бяспанскі С. Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі ў Беларусі (восень 1943 г. – вясна 1944 г.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. - № 1. – С. 24 – 28. 2. Освобождённая Беларусь. – Документы и материалы. – В 2-х кн. Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944. / Сост.: В.И. Адамушко и др. – Мн.: НАРБ, 2004. – 398 с. 3. Лемяшонак У. Беларуская наступальная аперацыя ў ацэнцы нямецкіх генералаў і афіцэраў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. - № 7. – С. 18 – 23. 4. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): Учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высш. образования / А.А. Коваленя и др.; Под ред. А.А. Ковалени, Н.С. Сташкевича; пер. с бел яз. А.В. Скорохода. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2004. – 279 с.*